Год II Пятніца, 27 студня 1922 г. № 19 (28)

РАНІЦА

штодзенная грамадзкая, палітычная і літэратурная газэта

АДРЭС РЭДАКЦЫІ і КАНТОРЫ:
Вільня, Вострабрамская № 4, „Hotel Szlachecki“ пак. № 2.
Рэдакцыя адчынянa што дня, апрача сьвят, ад 11 да 1 і ад 5 да 7 гадз.

Цана нумару 20 марак.

Падпіска на 1 мес. . . 400 марак.
З перасылкай 1 „ . . 500 „
За граніцай ў два разы даражэй.

ЦАНА АБВЕСТАК:
За адзін радок звычайнага друку на 1 стр.—60 м.
ў тэксьце . . . . 75 м.
за тэкстам . . . . 40 м.
Для шукаючых працы на 10 прац. таней.

Вільня, 27 Студня 1922 г.

Як паведамляюць газэты ў Бэрліне арганізаваўся фінансавы трэст, які згодзіцца ўзяць канцэсыю на ўсе цукровыя фабрыкі на Украіне і ў Расеі.

У склад трэсту ўвайшлі і быўшыя гаспадары гэтых цукровых фабрык, якія з свайго боку запрасілі ўвайсьці з імі ў супалку германскіх капіталістаў.

Нам няведама, на якіх варунках бальшавікі згадзіліся перэдаць цукроўні тым, у якіх яны, два годы таму іх адабралі?..

Няведама нічога і аб тых гарантыях, на якіх згадзіліся працаваць з бальшавікамі быўшыя гаспадары і германскія капіталісты, згадзіліся не палохаючыся навет тых крывавых распраў, якія рабілі камуністы над тымі гаспадарамі цукроўняў, якія не ўцяклі, а засталіся на Украіне.

Але ненасытны молох бальшавізму! Ён што дзень патрабуе новых афяр і тыя ці іншыя лёгкадумныя людзі, ашуканыя лгарствам савецкіх дыпляматаў пробуюць знайсьці шлях для гандлёвых зносін з Саўдэпіяй.

Гэтыя людзі меней ўсяго думаюць аб тых абставінах, якія будуць акружаць іх у бальшавізіі, аб тых варунках працы, якія ў самым карэньні забіваюць усе добрыя пачаткі, зводзяць да нуля ўсе гандлёвыя і прамысловыя справы.

Аб гэтым сьведчаць ня толькі ворагі бальшавізму, але і самі бальшавікі.

Да якога становішча, напрыклад, давялі яны цукровую прамысловасьць на Украіне?

Адказ на гэтае пытаньне даюць самі бальшавікі: „Калегія Кіеўскага районага ўпраўленьня цукровай прамысловасьці“ надрукавала брушуру пад назвай „Производственная програма 1921-22 г.“ У гэтай брушурцы напісана, што абшар засеву цукровых буракоў ў часе бальшавіцкага гаспадараваньня значна памншыцца.

У 1914-1915 г.г. было засеяна цукровымі буракамі 697.373 дз., з гэтага ліку ўцалела 686.296 дз., а ў 1920-21 г. г. засеяна толькі 181716 дзес. і з іх уцалела 149586; на 74 проц. меней, як да вайны. Яшчэ меней цукровых буракоў было зьвезена ў цукроўні: 1914-15 г.г. 62 міл беркаўцаў, а ў 1920-21 г.г. толькі 4 міл., што тлумачыцца па зніжкаю ўраджайнасьці.

Далей бальшавіцкая брушура сьцверждае, што лічэбнасьць перагнаных цукровых буракоў зьменшылася на 71 раз, а выхад цукру на 20 разоў. Гэта паказвае, што катастрафічнасьць цукровай прамысловасьці хаваецца ў самых фабрыках. Што-ж робіцца ў іх? А тое, што прадуктыўнасьць працы упала да minimuma.

У 1914—15 г. сярэдняя цыфра перагнаных цукровых буракоў на 1 фабрыку была 303555 беркаўцаў, а выраблянага цукру 429132 пуд; тым часам у 1920—21 г. у Кіеўскім районе напрыклад, сярэдняя лічэбнасьць перапрабленых цукровых буракоў была 15951 беркаўц, а сярэдняя лічэбнасьць выраблянага цукру 2 055 пуд на 21 раз меней.

Вось, яшчэ цікавыя цыфры, што да зьменьшэньня прадуктыўнасьці працы рабочага на цукроўнях: 1911—12 г. калі ў Расеі 96.855 рабочых — цукроўнікаў выпрацавалі 113 міл. пуд. цукру, што на кожнага прадстаўніка ў сярэднім выпадае 1167 пуд. цукру, а ў 1920-21 г. у Кіеўскім районе 10185 рабочых вырабілі 1.163585 пуд. цукру, што на кожнага рабочага выпадае ўсяго 114 пуд., ці ў 10 разоў меней!

Выраб цукру ўпаў да 4,3 проц. прадваеннага часу, зьменшыўся ў 23 разы!

Кожны заклад выробляе ў 21 раз меней чым раней.

Кожны працаўнік выробляе у 10 раз меней цукру!

Вось як вядуць цукровую гаспадарку бальшавікі, якія з гонарам кажуць: „фабрыкі ў нас упраўляюцца самі. Фактычным гаспадаром іх—рабочы!“

І нашым, і нямецкім і іншым капіталістам і прамыслоўцам трэба заўсёды памятаць, што покуль бальшавізм мае ўладу, ні якія гандлёвыя зносіны, ні якія фінансавыя справы нікаму ня прынясуць ніякай карысьці.

⟡ ⟡ ⟡ ⟡

ТЭЛЕГРАМЫ.

РЫГА 25, I. (А. В.). Эстонская „Palewalet“ у зьвязку з нарадай у Генуі паведамляе, што павінна быць салідарнасьць паміж усімі Балтыйскімі дзяржавамі і Польшчаю. Расея, наладзіўшы адносіны з Заходняю Эўропай, іноў распачне справу фэдэрацыі Балтыйскіх дзяржаў з Расеяй, і ня будзе прызнаваць іх незалежнасьці.

ХАРКАЎ 25. I. (А. В.). У Крыму банды галодных робяць напады на вёскі каб здабыць сабе харчы. Фунт хлеба там цяпер каштуе да 15.000 рублёў. Падобнае становішча пануе ў акаліцах Мікалаева і Херсона. Да гэтага часу адзначана ўжо шмат выпадкаў сьмерці ад голаду.

Халера пануе ў Харкаве і было некалькі дзесяткаў выпадкаў сьмерці. Хворых у Кіеві да 250 з якіх палова памерла.

ХАРКАЎ 25. I. (А. В.). У Харкаве, што далей, то чырвоная армія усё больш здэмаралізоўваецца. Жаўнеры ходзяць па хатах і адбіраюць хлеб.

МАСКВА 25. I. (А. В.) Нездаволяючыя вынікі працы рээвакуацыйнай камісіі далі аснову старшыне камісіі Альшэўскаму зноў выступіць. Ён прапануе вызначыць для камісіі парадак працы на бліжэйшыя тыдні. Цяпераka ідзе ацэнка дарагіх рэчаў, якімі бальшавікі заплацілі Польшчы па 2-ой 9-ці мільяновай ратоўцы.

Есьць шмат дробных рэчаў, каторыя трудна ацэніць і дзеля гэтага зацягнецца праца камісіі. Праз колькі дзён гэтыя цэннасьці вышлюцца ў Варшаву і тамака на нова будуць ацэнены.

КАТАВІЦЫ 26. I. (А. В.) Немцы выдалілі з Шлёнзкіх парафіяў 30 польскіх ксяндзоў. А якія яшчэ засталіся дык і ім тое самае пагражае.

КАТАВІЦЫ 26. I. (А. В.) Польская люднасьць Стжэлецкага і Люблінецкага паветаў вельмі тэрарызавана немцамі.

БЭРЛІН 25, I. (А. В.) З Саксоніі паведамляюць, што не атрымаўшы ў назначаны тэрмін адказу ад жалезнадарожнай ўлады, жалезнадарожнікі пачалі забастоўку.

Забастоўшчыкі сілаю спынілі рух цягнікоў.

ПАРЫЖ 25.I. (А. В.] Аўдыэнцыя пасла Замойскага ў прэмьера Пуанкарэ назначана на сягоньня.

Весткі з Варшавы.

ВАРШАВА 26. I. (А. В.). Віленскі Камітэт выдаў новаю адозву да грамадзянства, каб складалі афяры на выдаткі, што да Віленскай справы, якая павінна быць пад апекай Рэчы-Паспалітай аж да мамэнту, яе вырашэньня.

⟡ ⟡ ⟡ ⟡

Весткі з Варшавы.

24 студня ў вечары з Варшавы выехалі ў Рыгу на хаўтуры Папы Кардыналы Какоўскі і Дальбор. (A. W.)

Савецкі пасол у Варшаве Карахан вярнуўся з Масквы і быў прыняты Міністрам заграпічных спраў п. Скірмунтам.

Праўдападобна, што нарады ў справе польска-расейскага гандлёвага трактату пачнуцца ў хуткім часе ў Варшаве (А. В.).

24 студня ў Варшаве пачалася першая сэсія праваслаўнага сіноду ў Польшчы.

Старшыня міністраў п. Панікоўскі прыняў экзарха праваслаўных цэркваў Георгія, архібіскупа Варшаўскага, біскупа Холмскага і Новагродскага Пантэлеймона і біскупа Валынскага Дзіонісія. (А. В.)

24 студня адбылося пасяджэньне Палітычнага Камітэту Рады міністраў ахвяраванае справе перагавораў Польска-Нямецкіх аб горным Шлёнску. На паседжаньні быў прысутным п. Ольшэўскі. (А. В.)

⟡ ⟡ ⟡ ⟡

Навіны у тры радкі.

Паведамляюць, што меркулаўцы занялі г. Благавешчанск. Пры гэтым яны зьніштожылі атрад камуністаў, мабілізаваных у Благавешчанску.

У тылу чырвоных з'явіліся атрады хунхузаў, якія робяць вялікія шкоды бальшавіком.

У Саўдэпіі жалезнадарожны тарыф з 1 лютага падвышаецца на 50 проц.

Карэльскія паўстанцы занялі Мурманскую жалезную дарогу на працягу 2 міль.

Бальшавіцкія войскі адыйшлі, — страціўшы абозы.

У Крыму абвешчана мабілізацыя камуністаў ад 20 да 40 гадоў. Мабілізаваныя будуць адпраўлены для барацьбы з зялёнымі.

ХРОНІКА.

Да адкрыцьця Сойму.

Дзень адкрыцьця Сойму будзе абвешчаны як дзень сьвяточны. Усе ўстановы, фабрыкі, магазыны і інстытуцыі будуць зачынены.

Новы падатак.

На карысьць гораду зацьверджаны падатак на нумэры ў гасьцініцах, мебляваных пакоях, пансыонах і заежжых дамох.

Карасіна для Сярэдняй Літвы.

Гаспадарчая камісія ў Варшаве пры раскладцы карасіны па раёнах прызначыла для Сярэдняе Літвы некалькі дзесяткаў тысячаў пудоў, якую прывязуць у Вільню ў першай палове лютага.

Ангельскі капітал у Сярэдняй Літве.

У Вільні знаходзяцца прадстаўнікі ангельскай фірмы „Anglo Latwian Timber Trading Company", якія вядуць перагаворы з некалькімі вядомамі ўласнікамі лясоў і лесапрамыслоўцамі.

Фірма гэтая мае свае аддзелы ў Рызе (Латвія), Рэвелю (Эстонія), Фінляндыі і Данцыгу.

Скаргі на выбары.

Як паведамляюць, дэпартамэнт унутраных справаў С. Л. абвясьціў, што ніякіх скаргаў на дзейнасьць адміністрацыі і адміністрацыйных чыноўнікаў пры выбарах ня было.

Быў толькі адзін выпадак скаргі на аднаго з начальнікаў райёну, які агітаваў за той сьпісак, у якім сам лічыўся кандыдатам. (В. А. Р.).

Арэшты.

23 студня арыштаваны інспэктар О. К. О. п. Пимермахер.

Адбудова.

Польскі ўрад на працу па адбудове Віленшчыны дае лесны матэр'ял і коні. Расклад прысланых коней будзе даручаны гмінным уладам.

Сярод групы „Бел. Нац. Кам."

„Бел. Нац. Кам." разаслаў камунікаты ў якіх аглашае абстаноўку, пры якой былі зроблены арэшты ў ноч на 20 студня і ў самы дзень 20 студня. Камунікат сьведчыць, што арыштаваны асобы: 1) Сэкрэтар Бел. Нац. Кам., лічыўшы сябе ў час слуцкага паўстаньня глаўнакамандуючым Беларускімі паўстанчаскімі атрадамі на Случчыне) б. сябар Бел. Вайсковай Камісыі Андрэй Якубецкі, 2) Сябар прэзыдыума Бел. Нац. Кам., б. прэзэс Рады Случыны, В. Пракулевіч; 3) Сябар Бел. Нац. Кам. Ерэміч; 4) Сябар Бел. Нац. Кам. А. Карабач; 5) Рэфэрэнт Бел. Нац. Кам. Дубіна, 6) Сябар Бел. Нац. Кам., рэдактар „Белар. Ведам.", вядомы беларускі пісьменьнік вучыцель гімназыі М. Гарэцкі, 7) Сябар Бел. Нац. Кам. рэжысер бел-муз-драм гуртка І. Родзевіч, 8) Сябар Бел. Нац. Кам. сэкрэтар сувязі працаўнікоў селянскай гаспадаркі Невядомскі; 9) Прэзэс муз-драм. гуртка Ст. Валэйша, 10) Некалькі вучыцелеў і вучыцелек беларускіх народных школ, якія прыехаўшы з вёсак начавалі ў памешканьні Бел. Школьнай Рады. (W.A.P.)

Цукер.

Паведамляюць, што застаўшыйся пасьля выдачы па карткам цукер прадаецца ў гарацкіх крамах усім жадаючым па 265 марак за фунт.

Тыпы Палесься.

10. Раніца.

Доўга ляжаў я з адкрытымі вачыма і ня мог заснуць. Ночка ўжо панавала над лесам. Сьвяцілі зоркі, ўвасходзіў месячык...

Ганчар і Караба спалі. Хутка і я заснуў...

Лёгкі туман пакрываў паляну. калі мяне разбудзіў голас Ганчара.

— „Уставайце, сябра, сьнедаюць! Караба ўжо жаркое здабыў"!

Я адкрыў вочы.

Караба сядзеў на карачках, і смажыў нейкую птушку на вуглёх.

Я хутка ўскочыў на ногі. Халадок трохі прабіраў.

„Вось тутака недалёчка ёсьць крыніца"—паказаў мне Ганчар у бок лесу—„ля асіны" крыкнуў ён мне ў сьлед.

У лесе пачынала прасынацца жыцьцё то там, то тутака, над маёй галавой пачыналі сьпеваць у сваіх гнёздох птушкі.

Вось і асіна. Праўда, з пад яе карэньняў выбягаў маленькі ручаёк, і кімсь была зроблена ямка, каб болей было вады. Добра было памыцца халоднай вадой. Адразу зрабілася лёгка і прыемна.

Недзе здалёку крычалі журавы і гусі.

Туман пачаў гінуць, нарэшце саўсім зышоў, быццам паплыў кудысь у гушчар лесу.

Я падайшоў да сябраў.

— „Вось і качка гатова" весяла гаманіў Караба.

— „Сядайце!.. Эх добра раніцай ў лесе"! Сказаў Ганчар.

— „Ну"—падмаргнуў адным вокам Караба на Ганчара. „Давай сябра сваяго заводу"!..

„А"! Успомніў той, і праз хвілю мы выпілі па дзьве чаркі смачнага самагону.

— „Гэта—казаў Караба-каб было лепш нам сягоньня дайсьці да трох крыжоў.

— „Вось самі пабачыце, як дойдзем да іх",—адказаў ён.

Добра пасьнедаўшы, мы, згасіўшы рэштку вогнішча, крануліся ў дарогу.

Маленькі фельетон.

Характэрыстыка.

Жывучы ў Вільні мне прышлося пазнаёміцца з адным вучоным, які ўжо некалькі месяцаў працуе над характэрыстыкай беларускіх дзеячоў...

Мы з ім хадзілі вячэраць у Беларускі Клюб, дзе часамі доўга праседжавалі пры шклянцы гарбаты, гутарачы аб здарэньнях апошніх гадоў. Праз нейкі час, калі нашы адносіны сталі на столькі блізкімі, што я ўжо мог сьмела запытацца аб яго жыцьці і працы.

— Ну, як жа ваша вучоная праца ідзоць?

— Мая праца...

Ен трохі засьмяяўся і змоўк.

Нешта не так,—падумаў я,—мусіць праца была не пад сілу: узяўся за гуж, а пасьля пабачыў, што ня дуж.

Мне паказалася, што я яго абразіў сваім запытаньнем дзеля чаго надалей стаў старацца загладзіць сваю віну.

— Такую працу, як грунтоўная і фундамэнтальная характэрыстыка цэлага, так сказаць, грамадзянства не напішаш у два тры дні,—сказаў я, стараючыся хоць трохі залагодзіць яго.

Ен памаленьку падняў галаву і проста глянуў мне ў вочы.

— Ах, колькі разоў браўся за пяро!

— Ну?

— І зноў кідаў яго, баючыся, што мая праца будзе занадта аднабокай... Ну, а цяпер... цяпер, па праўдзе, я й сам ня ведаю..

Ен гаварыў ціха, адрывіста, як сам да сябе.

— Дзеля таго, ведаеце, — гаварыў ён далей, раптам ажывіўшыся, — я над гэнай працай даўно ламаю ўжо мазгі і кожны раз прыходжу да зусім новых вываdaў і на столькі пярэчачых адзін другому, што проста ня верыцца.

— Ну, як жа вы зьбіраеце матэр'ял для сваей працы?

— Ось у гэтым то і ўся штука... Я ніяк не магу знайсьці адпаведнага сыстэму. Калі маеце трохі вольнага часу і ахвоты, дык паслухайце, я вам раскажу.

— О, я вам за гэта буду вельмі ўдзячны.

— Я з пачатку думаў зрабіць гэта такім парадкам: у кожнага чалавека ёсьць свае прынцыпы і яны разумеецца, лепей за ўсё акрэсьляць яго характар. Значыцца, калі зьбяру такія характэрыстыкі, ды пасьля патраплю з іх зляжыць досыць поўную характэрыстыку беларускіх дзеячоў. Ну, як вам падабаецца мой мэтад?

— Гэта-ж надта, надта добры, — адказаваю я.

— І я так думаў, Доўга не чакаючы, я ўзяўся за работу. Паміж іншым на гэту працу патраціў колькі месяцаў, бо мусіць гэтых знаёмых лавіць па Вільні, Варшаве, Горадні, Лодзі. Пры спатканьні ў мяне было заўсёды пытаньне,

„Вы знаёмы з панам Х?"

„А як-жа, гэта найлепшы мой прыяцель," чуўся адказ.

Што гэта за чалавек,—пытаўся я далей. — Ці ня можаце апісаць яго мне характар?

Тут заўсёды пытаны рабіў таемны выгляд твару.

„Ведаеце, гаворачы вам шчырую праўду, гэта недалёкая, бездарная асоба, —гаварыў адзін."

„Машэньнік, злодзей—гаварыў другі больш энэргічны."

„Правакатар, палітычны авантурнік, — з пенай на вуснах гаварыў трэці.

— І ўсюды ад усіх гэта самае. Пасьля некалькі месяцаў працы, я прышоў да перакананьня, што ўсе беларускія дзеячы, згодна характарыстыкі іхніх прыяцеляў, шантажысты, зладзеі, правакатары, або ў лепшым выпадку ідыёты. Такі вывад паказаўся мне аднабокім. Я сказаў сабе:—тут вінаваты ня людзі, а мая сыстэма...

І вы зьмянілі яе?

— Так. Я прыдумаў зусім другую: характар вядомага грамадзянства найлепш й адбіваецца ў яго літэратуры. Значыцца, каб зьведаць характар данага грамадзянства, трэба пазнаёміцца, што пішуць яго сябры... Тут я парваў ўсе знаёмства і надпісаўся на ўсе газэты, якія выходзяць у нашым краі, ў якіх працуюць беларускія дзеячы розных палітычных паглядаў, розных палітычных ар'ентацый. І ведаеце на які аддзел друку я зьвярнуў больш увагі?

—.На хроніку беларускага жыцьця!

— Так... На розныя камунікаты „Найвышэйшай", на розныя прыказы „главнакамандуючых" войск Б. Н. Р., на розныя абвесткі замест перадавіц, аб нейкіх злачынствах беларускіх дзеячоў, на розныя аднаднёўкі, на артыкулы, што толькі урад Ластоўскага ёсьць правамоцным, а „Найвышэйшая"—самазванная і наадварот... Ды дзе тут усё пералічыш...

Вось тут я й пазнаёміўся, што людзі пішуць, як пішуць і аб чым пішуць і ведаеце да якіх вынікаў прыйшоў: што ўсе беларускія дзеячы палітычныя авантурнікі, самазванцы, здраднікі свайго народу, зладзеі якіх сьвет ня бачыў, плеткары больш за вясковых баб. Ну і рабі што хочаш. Як-жа тут не задумацца... Але я здэцыдаваўся на рэшце ужыць самы радыкальны мэтад: гэта пытацца кожнага пра яго самога. Пэўнаж, кожны чалавек хоць трохі знае сябе, думаў я, значыцца, трэба толькі вызваць яго на шчырасьць.

— А, ведаеце што гэты апошні мэтад—самы найлепшы,—вырвалася у мяне.

— І мне гэта так здавалася, кажуць, што гарэлка найлепшы ключ да сэрца чалавечага. Дык я стаў паіць гэтых дзеячоў гарэлкай і выклікаць іх на шчырасьць.

— Ну? —

— Ну і дайшоў, што ўсе няпераможныя беларускія дзеячы—гэта тыя натуры, якія, калі-б ня лёс і не людзкая злосьць, дык ого,-го'-го!

Як гэта ого-го-го?

— І мне гэта не зразумела. Але гэтак усе яны акрэсьлілі свае геніяльныя місіі, да якіх былі прызваны самым Богам,—але, бачыце, жыцьцё ўнясло іхнія пляны.

І зноў стала ціха.

Але зараз-жа мой вучоны загаварыў.

— Тут, запраўды звар'яцееш, — ледзь не плачучы гаварыў ён далей. Што я магу сказаць аб чалавеку, які зьяўляецца адначасна і цёмнай асобай, і злодзеям, і незразумелым для грамадзянства геніям, і самазванцам, і дэмакратам, які нюхаецца з чорнай рэакцыяй і ест.

— Параіце, калі ласка, як закончыць мне сваю працу?—

Я няведаў, што сказаць яму на пацеху. Гутарка больш ня клеілася, мы пашлі дамоў.

Мой бедны вучоны быў ў самым агідным настрою і ўсю дарогу маўчаў і толькі, ідучы, пляваў на бакі хадніка.

Я ў душы моцна шкадаваў яго і радаваўся за сябе, што не пакусіў мяне нячысьцік пісаць такую грунтоўную і фундамэнтальную характэрыстыку дзеячаў, сярод якіх жыву.

Янка з Хаценчыц.

Стэнаграма З'езду Заходняй Беларусі.

(Глядзі з 1 да 21 № „Раніца".)

Старшыня: Цяпераka прошу, хто жадае, сказаць за, ці проці.

Студэнт: (проці) Грамадзяне. Польскі Сойм, яшчэ ў 1919 годзе прыняў аграрную рэформу. Але не заўседы тое, што можа быць добрым для палякоў—павінна быць добрым і для беларусаў. Тамака і зямля другая, там і паноў-абшарнікаў меней, як у нас па Беларусі. Гэтая рэформа для нас не падходзіць. Па гэтай рэформе кожны абшарнік можа пакінуць сабе 750 дзесяцін зямлі. Трэба дамагацца ад імя З'езду, каб скараціць гэтую цыфру да 200 дзесяцін. Паны прадаюць зямлю, а сяляне застаюцца без зямлі,—дзеля гэтага трэба забараніць панам прадаваць зямлю, а калі прадасьць, дык налажыць на яго вялікі штраф. Цяпераka, што да каланізацыі. Прыежджаюць з Польшчы, з Галіцыі і адбіраюць у сялян зямлю і робяць з ею, што хочуць. Наша зямля павінна быць для нас, для нашага народу! Цяпераka аб інцыдэнце з нашымі студэнтамі...

Старшыня: Калі мы скончым нашу працу, дзеля каторай сюды з'ехаліся, дык тагды будзем гаварыць аб інцыдэнтах... Я прашу вас скончыць сваю прамову ў рамках аграрнага пытаньня. Прэзыдыум просіць вас даць канкрэтную рэзалюцыю.

Студэнт: (чытае рэзалюцыю, але ў чарнавіку стэнаграмы яна аказалася незапісанай).

Старшыня: (проці) Прыказаць Сойму даваць замест 750 дзесяцін - 200, мы ня толькі ня можам і немаем права, але гэта нават сьмешна. Ды і чаму 200 дзесяцін а не 50 ці 300? А мо і 15 такому абшарніка было-б годзі?!.. Мы будзем дамагацца, каб абшарнікаў саўсім ня было, а каб была толькі дробная зямельная ўласнасьць і на гэтым прынцыпе мы будзем стаяць і ў Сойме. Я стаўлю на галасаваньне рэзалюцыю вынясеную камісіяй а пасьля рэзалюцыю, якую прапануе пан Студэнт.

Прыймаецца рэзалюцыя камісіі.

(Далей будзе).

Абвестка.

Згублена

20 сьнежня 1921 году засьведчэньне на імя паручніка Гузнея Якуба, выданае праз Dowództwo Obozu internowanych w Dorohusku za Nr. 100 od 18 maja 1921 roku.

Знайшоўшага прашу вярнуць у Рэдакцыю.

Рэдактар-Выдавец: Вацлаў Адамовіч

Друкарня „Друк" Субач 2.